РАЗАМ СВЯТКУЕМ ЮБІЛЕЙ «АЛЕСІ» 5






УСЁ БОЛЬШ МОКРЫ СНЕГ 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

15 ЛІСТАПАДА 2024 г. ПЯТНІЦА № 223 (30357)

З першых вуснаў

# «ПУНКТ РОСТУ — ГЭТА ДЗЕЦІ. ТАМУ МЫ І Ў ДВАРАХ СТАДЫЁНЫ БУДУЕМ»

## Спартыўныя тэмы, маладзёжныя ініцыятывы і пытанні на злобу дня — акцэнты рабочага дня кіраўніка дзяржавы

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў стадыён «Трактар» і парк побач з ім у першы дзень функцыянавання комплексу пасля рэканструкцыі. Тыдзень таму, падчас адкрыцця новага басейна, старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў запрасіў кіраўніка дзяржавы наведаць абноўлены сталічны аб'ект. Прэзідэнт запрашэнне прыняў.**

Разам з тым святочны характар мерапрыемства не перашкодзіў размовам на надзённыя тэмы. Найперш Прэзідэнт нагадаў пра «даўжок», маючы на ўвазе заканчэнне работ на «Мотавелазаводзе». «Гэта вельмі важна, таму што сацыяльныя аб'екты — гэта добра, але патрэбны вытворчасці — грошы зарабляць», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Цяпер на заводзе ідзе ўстаноўка абсталявання, у пачатку 2025 года аб'ект будзе гатовы, далажылі кіраўніку дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што работы трэба паскорыць, каб у студзені да выбараў падарыць мадэрнізаванае прадпрыемства народу. Таксама кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што ў найбліжэйшыя месяцы неабходна завяршыць будаўніцтва завода па вытворчасці аўтобусаў «МАЗ» і нацыянальнага выставачнага цэнтра. «Па выніках года падвядзём вынікі па якасці. Найлепшыя тавары выставім там», — заўважыў беларускі лідар.

Прэзідэнту паказалі вынікі рэканструкцыі парку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. Дарэчы, гэта другі па велічыні парк у сталіцы, які займае 68 гектараў. Пасля рэканструкцыі ён стаў яшчэ больш прывабным для мінчан: з'явіліся пляцоўкі для валейбола і міні-футбола, стрытбола і варкаўта, для скейтбордынгу і заняткаў на вулічных трэнажорах, стала больш месцаў для адпачынку. «Даўні-даўні парк. Я пастаянна міма ездзіў, шмат разоў заязджаў сюды і на стадыён, — успомніў Аляксандр Лукашэнка. — Гэты парк даўні, для народа пабудаваны. Народны парк, добры парк».



Фота БелТА.

### Дзеці павінны прыводзіць бацькоў на спартыўныя пляцоўкі

Асобна старшыня Мінскага гарвыканкама далажыў пра добраўпарадкаванне сталіцы і развіццё спартыўнай інфраструктуры. Па яго словах, у горадзе робіцца ўсё, каб людзі адчувалі сябе камфортна і ў кожным раёне маглі займацца фізкультурай. За апошнія два гады завершана будаўніцтва трох паркаў: Уга Чавеса ў Каменнай горцы, імя М. Я. Паўлава ў Маскоўскім раёне (каля студэнцкай вёскі) і яблыневага сквера каля Першага нацыянальнага гандлёвага дома. Уладзімір Кухараў адзначыў, што да нядаўняга часу ў Мінску заставалася нямала лакальных зялёных зон, якія не былі добраўпарадкаваны. Адміністрацыі раёнаў узяліся за вырашэнне гэтай праблемы — за тры гады зрабілі 64 зоны адпачынку, якія з задавальненнем наведваюць жыхары і госці сталіцы. «Вельмі дастойна», — ацаніў кіраўнік дзяржавы.

Уладзімір Кухараў расказаў, што ў Мінску працягваецца развіццё сеткі веладарожак. Цяпер іх 293 кіламетры. «У наступнай пяцігодцы мы плануем яшчэ 85 кіламетраў. Такім чынам, агульная сетка перавысіць 380 кіламетраў, што дазволіць з любога мікрараёна на веласіпедзе дабрацца да любога пункта ў горадзе», — адзначыў ён.

«Гэта важна. Мы Мотавелазавод захавалі, развіваем. Вось веласіпеды — перамяшчайцеся», — заўважыў Прэзідэнт.

Не спыняецца работа па добраўпарадкаванні дваровых спартыўных пляцовак. Цяпер іх налічваецца 344. За апошнія тры гады ў поўны парадак былі прыведзены 225. Старшыня Мінгарвыканкама запэўніў, што ў 2025 годзе гэта работа будзе завершана. Ён таксама расказаў, што за два апошнія гады ў кожным раёне Мінска зроблены лыжныя трасы са штучным снегам. Акрамя гэтага, у сталіцы працуюць чатыры лыжаролерныя трасы. «І школы туды, на лыжы», — падкрэсліў Прэзідэнт. Па словах Уладзіміра Кухарава, у кожнай з 245 мінскіх школ ёсць спартыўнае ядро, і кожны школьны стадыён адкрыты для людзей днём і вечарам. «Гэта правільна. Дзеці павінны туды весці бацькоў», — ацаніў Аляксандр Лукашэнка.

Для ўсіх ахвотных адкрыты і знакамітыя спартыўныя аб'екты. Напрыклад, у падтрыбунных памяшканнях Нацыянальнага алімпійскага стадыёна «Дынама» адкрыты цір і скаладром, вельмі папулярныя ў наведвальнікаў. На вуліцы Жудро ўведзены ў строй тэнісныя корты. Па словах Уладзіміра Кухарава, гэта быў даўгабуд, але аб'ект прывялі ў парадак. Цяпер там дзейнічаюць чатыры корты са штучным пакрыццём і чатыры — з земляным. Прэзідэнт падкрэсліў, што гэты аб'ект павінен быць хоць і даступным, але не бясплатным. Значная частка бюджэтных сродкаў затрачваецца на падрыхтоўку спартсменаў (у тым ліку і тэнісістаў), стварэнне спартыўнай інфраструктуры, падрыхтоўку трэнераў і гэтак далей. «Мільянерамі становяцца тэнісісты за бясплатна. А ніхто не дапамагае практычна... Таму хочаш гуляць — плаці. Або дагавор заключай. Стаў багатым — рабі ўнёсак», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка.

Цяпер у Мінску добраўпарадкаваны дзевяць міжшкольных стадыёнаў (у кожным раёне горада), дзе ёсць футбольнае поле са штучным пакрыццём, лёгкаатлетычныя дарожкі і ўсе спартыўныя трэнажоры. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як футбалісты раней скардзіліся на тое, што ствараецца шмат хакейных пляцовак, і звярнуў увагу, што футбольныя палі і ўсе ўмовы для заняткаў футболам ёсць у кожным раёне Мінска. «Ідзі — гуляй. Я як футбаліст гавару: калі б такія ўмовы былі раней», — заўважыў ён.

Па словах Уладзіміра Кухарава, на наступны год запланавана ўвядзенне ў строй двух фізкультурна-аздараўленчых комплексаў — у Каменнай горцы і Лошыцы. Таксама завяршаецца рэканструкцыя спарткомплексу «Дынама» на вуліцы Даўмана, які таксама будзе ўведзены ў эксплуатацыю ў 2025 годзе. Акрамя таго, прынята рашэнне зрабіць у лясным масіве «Мядзведжына» лыжаролерную трасу працягласцю 2,5 кіламетра і добраўпарадкаваны цір для біятланістаў.

СТАР. 2

КОРАТКА

- Прырост сярэдняй шырокай грашовай масы ў гадавым выражэнні запаволіўся ў кастрычніку да 14,4 %.
- **У Беларусі прадоўжаць «зямельную амністыю» да 1 студзеня 2028 года.**
- Па выніках 10 месяцаў 2024 года найбольшы аб'ём здзелак па набыцці прадукцыі сельскай гаспадаркі на Беларускай універсальнай таварнай біржы прыпаў на кампаніі з Расіі, Казахстана і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.

Бяспека

# У ратавальнікаў работы хапала

## Як прайшло самае спякотнае лета, расказалі спецыялісты АСВОД



**Купальны сезон 2024 года стаў адным з самых напружаных для ратавальнікаў АСВОД. У першую чаргу на гэта паўплывала стабільна спякотнае надвор'е на працягу ўсяго купальнага сезона. Сярэдняя дзённая тэмпература склала плюс 23 градусы, што на тры градусы вышэй, чым звычайна. Паводле звестак Белгідрамета, лета 2024-га стала другім самым гарачым з 1881 года. Была зафіксавана вялікая колькасць вельмі спякотных дзён — іх сіноптыкі налічылі 28. На купальны сезон паўплываў і той факт, што беларусы аддавалі перавагу адпачынку на вадаёмах унутры краіны, пры тым што ў спякотнае лета людзі шмат купаліся, вялікай колькасці ўтапленняў удалося не дапусціць.**

### У калодзежы, бочцы, падвале...

Як расказала **вядучы спецыяліст па сувязях з грамадскасцю рэспубліканскага савета АСВОД Кацярына МІХАЛЁВА,** за купальны сезон 2024 года выратаваны 170 чалавек, з іх 19 непаўналетніх. Патануў 241 чалавек. Усяго з пачатку года на вадаёмах выратаваны 210 чалавек. За апошнія пяць гадоў па краіне колькасць патанулых удалося знізіць на 10 працэнтаў.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «ПУНКТ РОСТУ — ГЭТА ДЗЕЦІ. ТАМУ МЫ І Ў ДВАРАХ СТАДЫЁНЫ БУДУЕМ»

## Трэба працаваць з трэнерамі, каб давалі вынік

Побач з паркам імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка знаходзіцца Дом фізічнай культуры «Кольцы славы», дзе займаюцца выхаванцы Спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву па спартыўнай гімнастыцы і акрабатыцы. Дом фізкультуры быў пабудаваны ў 1956 годзе для гульнявых відаў спорту. У 1970-м яго перадалі дзіцяча-юнацкай школе па спартыўнай гімнастыцы. У 2023 годзе Дом фізкультуры, з якога выйшла нямала майстроў спорту, рэканструявалі. Гістарычны абноўлены аб'ект наведаў і Прэзідэнт. «Традыцыі — гэта добра, але нам патрэбны вынікі цяпер», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, кажучы пра сучасны стан спартыўнай гімнастыкі. Галоўнае, па яго словах, для дасягнення выніку — трэнер: «Ёсць трэнер — будзе вынік, не будзе трэнера — не будзе выніку. Таму трэба працаваць з трэнерамі для таго, каб давалі вынік. Няма выніку — трэба развітвацца і малады рухаць».

На важнасць працы з трэнерскім складам Прэзідэнт зрабіў акцэнт і падчас размовы са старшынёй Беларускай федэрацыі футбола. «У мяне да цябе толькі адно пытанне — «Калі?» — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да Мікалая Шарснёва, маючы на ўвазе доўгачаканыя перамогі беларускіх футбалістаў. Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на расійскі досвед аб'ядання ў адну федэрацыю водных і гімнастычных відаў. Па яго словах, пра такі падыход варта падумаць і ў Беларусі, каб блізкія віды спорту былі аб'яднаны ў адзін кулак.

Нацыянальны футбольны стадыён, будаўніцтва якога будзе скончана ў гэтым годзе, Аляксандр Лукашэнка назваў авансам для футбалістаў. Мікалай Шарснёў расказаў, што федэрацыя актыўна працуе над выхаваннем новага пакалення футбалістаў. «Ужо з гэтага года мы поўнасцю аднавілі сістэму падрыхтоўкі, пачынаючы ад 7 гадоў. У нас поўнасцю сфарміраваны чэмпіянаты рэспубліканскага ўзроўню з 9, 10, 11, 12, 14 гадоў. І гэты чэмпіянат ужо праходзіць. У дзіцячым футболе на сёння сфарміравана сістэма падрыхтоўкі. Далей гэта ўзровень трэнерскай працы, нагрузкі, таму што калі ў дзяцінстве не сфарміруеш хуткасныя якасці, вынослівасць, потым ужо складана ад гэтым казаць», — расказаў Мікалай Шарснёў. Аднак, па словах Прэзідэнта, неабходна павышаць і фізічную падрыхтоўку футбалістаў і ў вядучых камандах. І гэта таксама адказнасць трэнераў.

## Хуткасць і фізічная падрыхтоўка

Размова пра футбол працягнулася і ў чашы стадыёна «Трактар». Знакаміты аб'ект пабудаваны ў 1950 гадах. За сваю гісторыю ён перажыў некалькі рэканструкцый, апошняя з якіх завяршылася да 7 лістапада гэтага года. Праводзілася яна невыпадкова. Прэзідэнт нагадаў, што пасля дасягнення дамоўленасці з кітайскімі партнёрамі аб будаўніцтве нацыянальнага футбольнага стадыёна было вырашана і свой стадыён «Трактар» прывесці ў парадак. Цяпер тут добраўпарадкавана гульнявое поле з натуральным пакрыццём, уздоўж якога размешчаны чатыры бегавыя дарожкі, а за варотамі — два палі са штучным пакрыццём для міні-футбола. Назіраць за гульнёй з трыбун могуць больш за 5,8 тысячы чалавек. Плануецца, што тут будуць праходзіць матчы вышэйшай лігі чэмпіянату Беларусі па футболе. Абноўлены стадыён «Трактар» таксама будзе дамашняй арэнай для мужчынскай і жаночай каманд футбольнага клуба «Мінск».

Візіт Прэзідэнта на некалькі хвілін прыпыніў трэніроўку жаночай каманды «Мінск». Аляксандр Лукашэнка расказаў дзяўчатам пра сваю футбольную кар'еру і пра тое, як яна скончылася — з-за траўмы калена. Аднак, па словах Аляксандра Лукашэнкі, на сучасных палях надта сур'ёзныя траўмы спартсменам пагражаюць рэдка: палі якасныя, мяккія і роўныя. Футбалісткі папрасілі Прэзідэнта падпісаць мяч «на ўдачу», які зойме пачэснае месца ў музеі клуба.

Асобная парада ад кіраўніка дзяржавы футбалісткам — працаваць над фізічнай падрыхтоўкай. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускія гульцы павінны выступаць так, каб не было патрэбы ў легіянерах. Па яго словах, многія спартсмены з іншых краін і самі хочуць выступаць у Беларусі, але прыярытэт за беларусамі. «Паспехаў вам. І, самае галоўнае, каб без траўм. І запомніце: хуткасць і фізічная падрыхтоўка. Калі гэта ў вас — будзеце выйграваць. Не — вы адстанеце. Хакей і футбол ужо такія хуткасці атрымалі. Хуткасць шалёная, хутка трэба гуляць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## Сустрэча з байцамі студатрадаў — як бальзам на сэрца

Рэканструкцыя стадыёна «Трактар» была аб'яўлена маладзёжнай будоўляй, у ёй прынялі ўдзел студэнцкія будаўнічыя атрады ўсіх ВНУ Мінска. Рабілі і для сябе — плануецца, што ў хуткім часе на стадыёне пачне функцыянаваць маладзёжная крэатыўная прастора, якая стане цэнтрам прыцягнення сталічнага актыву БРСМ. Прэзідэнт сустрэўся і з маладымі людзьмі. Аляксандр Лукашэнка згадаў, што ў свой час таксама працаваў у будатрадзе (трэба было зарабляць грошы) і атрымаў карысны досвед, які застаўся на ўсё жыццё. «Гэта зусім іншы студэнт, калі ён пабыў у будатрадзе. Абсалютна іншы. Мяне не трэба было прывучваць да працы, я ўсё жыццё працаваў у вёсцы з дзяцінства. А гарадскія з намі, пабываўшы ў будатрадзе, зусім іншыя людзі. Таму я гэта ведаю і прыхільнік гэтага», — успомніў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што БРСМ павінен засвойваць кірункі, якія сапраўды патрэбны людзям: будатрадаўскі рух, яго кіраўнік дзяржавы назваў канькам БРСМ, валанцёрскі рух, дапамога пажылым людзям.

Маладыя людзі задалі Прэзідэнту некалькі пытанняў, у тым ліку і на футбольную тэму. У Аляксандра Лукашэнкі спыталі пра яго самыя яскравыя ўражанні ў футболе. Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што самыя яркія футбольныя ўспаміны звязаны з гадамі вучобы ў школе, калі на футбольным полі збіралася ўся вясковая моладзь. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што займаўся футболам і ў студэнцкія часы, гуляў за розныя каманды. «Але ў мяне вось гэта засталося — вясковая закваска. Я тады шмат бегаў, займаўся спортам. Хацеў быць футбалістам. Але потым траўміраваў калена і перайшоў у хакей», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Футболам рэкамендую займацца, але не рэкамендую бегаць па асфальце, таму што з часам гэта заўсёды вылазіць бокам. А самае, кажуць, лепшае — гэта веласіпед і плаванне». Але, як прызнаўся Аляксандр Лукашэнка, сам ён плаванне не любіць, паколькі гэта вельмі нудная справа, а вось веласіпед — з задавальненнем.

Не пакінулі без увагі і новыя спартыўныя аб'екты — басейн, футбольны стадыён. У Прэзідэнта спыталі, ці можна лічыць іх пунктамі росту айчыннага спорту. На словах Аляксандра Лукашэнкі, пункты росту — невялікія пляцоўкі, дзе трэнеры могуць заўважыць перспектыўных дзяцей і давесці іх да п'едэстала. «Галоўная праблема ў нас — гэта фізічны стан спартсменаў. Фізічна не гатовы па асобных відах спорту на самым высокім узроўні выступаць. Не гатовы фізічна. У футболе яны не могуць бегчы з першай да апошняй хвіліны. 90 хвілін яны не могуць бегаць. А сёння яшчэ і думаць трэба. Футбол стаў вельмі хуткім. А фізічны стан адкуль? Ад пунктаў росту. А пункт росту — гэта дзеці. Таму мы і ў дварах стадыёны будуем. У нас ужо гэтых пляцовак мора. Галоўнае — захапіць дзяцей. Пункты росту — у дварах», — растлумачыў сваю пазіцыю Прэзідэнт. Пры гэтым ён заўважыў, што з дзецьмі трэба працаваць ужо з першага класа школы, а па некаторых відах, напрыклад, мастацкай гімнастыцы, і раней. Па словах кіраўніка дзяржавы, усё залежыць і ад бацькоў. У выхаванні дзяцей на першае месца ён паставіў вучобу, на другое — спорт, на трэцяе — англійскую мову. «Вялікая справа, калі ты прыходзіш у нейкую кампанію і свабодна валодаеш англійскай моваю, усе цяпер размаўляюць на англійскай мове. Родная мова і следам — англійская. І ўжо ці футбол, ці хакей, калі здольнасці ёсць. І я настойваў заўсёды на музыцы, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Вось такія чатыры-пяць кірункаў у сваім дзіцяці ты павінен убачыць і іх развіваць. Таму многае залежыць ад бацькоў». Асобна кіраўнік дзяржавы вылучыў выпадкі, калі дзіця ідзе па слядах бацькоў і абірае такую ж прафесію. Па яго словах, гэта добра, але не павінна быць кланавасці, калі бацькі дапамагаюць сыну ці дачцэ ўладкавацца на працу. Па яго словах, гэта амаль удалося ліквідаваць, асабліва калі «мэтавікоў» сталі набіраць. «Але з «мэтавікамі» таксама будзем глядзець. З «мэтавікамі» атрымалася так, што слаба падрыхтаваныя гэтыя «мэтавікі». На гэта таксама будзем увагу звяртаць», — адзначыў беларускі лідар. Аднак разам з тым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што мэтавае накіраванне дае і шэраг пераваг. Па-першае, яно дазваляе паступіць у ВНУ маладым людзям з вёскі. Па-другое, гэта дамова з прадпрыемствам.

У снежні адбудзецца Усебеларускі злёт студэнцкіх атрадаў, дзе будзе закрыты трэці працоўны семестр. Маладыя людзі запрасілі і Прэзідэнта на гэта ўрачыстае мерапрыемства. Аляксандр Лукашэнка адказаў, што абяцаць не можа, паколькі вельмі насычаны графік: увагі Прэзідэнта патрабуюць пытанні ўнутранага і знешняга характару. «Таму я баюся паабяцаць і не прыехаць. Але калі я сустракаюся з байцамі студэнцкіх атрадаў — для мяне бальзам на сэрца. Я ўспамінаю сваё студэнцкае жыццё, мне заўсёды прыемна сустракацца з вамі, бо вы такія, як я калісьці быў. Таму, калі атрымаецца, я хоць на некалькі хвілін зазірну ў вашу сям'ю», — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўніку дзяржавы расказалі пра яшчэ адзін кірунак дзейнасці БРСМ — маладзёжныя атрады аховы правапарадку. «Гэта вельмі правільна. Парадак на вуліцах мы павінны наводзіць самі, вы самі. Нам трэба захаваць і нават узмацніць той парадак, які ў нас ёсць. Яшчэ раз гавару: гэта для вас і вашых дзяцей. Асабліва для дзяцей. Вось замежнікі прыязджаюць да нас: слухайце, ды ў Беларусі можна дзіця ў парк адвесці, ніхто яго там не пакрыўдзіць. Гэта дарагога варта», — падтрымаў гэтую ініцыятыву Аляксандр Лукашэнка. Асабліва, па яго словах, гэта важна ў такі адказны перыяд, як электаральная кампанія.

На памяць аб гэтай сустрэчы кіраўнік дзяржавы пакінуў аўтограф на касцы байца будатрада.

## «Будзем разам змагацца за той курс, які мы даўно вызначылі»

Пачуць адказы на свае пытанні ад Прэзідэнта хацелі не толькі футбалісты і актывісты, але і журналісты. А ў іх пытанні — на злобу дня. І самая актуальная тэма — выбары. Цяпер актыўна ідзе збор подпісаў для вылучэння ў кандыдаты ў Прэзідэнты. У Аляксандра Лукашэнкі пацікавіліся, колькі подпісаў сабралі за яго. «Мяне ўчора інфармавалі, што на сёння больш за 700 тысяч подпісаў сабрана. Недзе так», — адказаў ён. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што пакуль уважліва за гэтым не сачыў з-за насычанага графіка, у якім шмат паездак па краіне і за мяжу. У полі зроку і мноства бягучых пытанняў, у тым ліку і такіх глабальных, як завяршэнне ўборачнай кампаніі. «Людзей трэба накарміць. Трэба даць прадукты харчавання, каб яны маглі купіць. У нас сёння ёсць усё і нават больш таго, што мы чакалі, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Аграрыі святкуюць свята сваё святое. Дзякуй ім вялікі. Я не дарма паехаў па «Дажынках» — для таго, каб падзякаваць людзям і паглядзець зверху, як яны выконваюць мае даручэнні, асабліва як аруць глебу, паднімаюць зябліва».

Што да выбарчай кампаніі, то Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ўжо нават прапаноўваў завяршыць збор подпісаў у падтрымку сваёй кандыдатуры. Аднак кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой адзначыў, што людзям трэба даць магчымасць падтрымаць свайго лідара. «Мы не нагнятаем абстаноўку. Я запланаваў перагаварыць з кіраўніцтвам ініцыятыўнай групы, падзякаваць ім на першым этапе. І пагаварыць, як мы далей будзем рухацца, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Галоўнае, каб «альтэрнатыўшчыкі» таксама збіралі свае подпісы. Але, як мне дакладваюць, людзі не вельмі ідуць на тое, каб ставіць подпіс за іншага кандыдата. Мяне гэта радуе і вельмі сур'ёзна напружвае: для мяне самае галоўнае і самае страшнае — гэта давер людзей». Па яго словах, пасля 2020 года людзі зразумелі, што могуць страціць краіну, і зразумелі, што трэба шанаваць тое, што ёсць. «І вось, зыходзячы з гэтага, людзі ідуць, але не вельмі, на подпісы за іншых. Але нічога страшнага ў гэтым няма», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што быў прыхільнікам таго, каб усе партыі, буйныя грамадскія арганізацыі вылучалі сваіх кандыдатаў у Прэзідэнты.

«Вылучылі: Оля Чамаданава ў нас была і Бобрыкаў. Ну, нармальныя людзі. Канешне, яны прыхільнікі Прэзідэнта. І яны ішлі: «Мы ведаем, што Прэзідэнт выйграе, але мы не дадзім яго пакрыўдзіць». Як быццам мяне нехта мог пакрыўдзіць. А потым пагледзелі: унутры арганізацый не вельмі гэта разумеюць. І яны: «Лепш мы знімемся». Ну, як мяне паінфармавалі. Я толькі ўчора даведаўся, што яны зняліся з гэтай дыстанцыі. Будзем разам змагацца за той курс, які мы даўно вызначылі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, няма ніякага страху ў тым, што ў выбарах будуць удзельнічаць усе, хто захоча. «Мы больш не дадзім магчымасці краіну ні нахіліць, ні на калені, крый божа, паставіць, ні разбурыць. Гэта выключана, як бы камусьці гэта ні хацелася», — дадаў Прэзідэнт.

## «Жанчыну нельга абцяжарваць такімі паўнамоцтвамі, такімі абавязкамі»

У Аляксандра Лукашэнкі пацікавіліся і яго меркаваннем наконт таго, ці можа ў Беларусі жанчына быць Прэзідэнтам. На што ён згадаў класічнае: прэзідэнтамі не становяцца — прэзідэнтамі нараджаюцца. «У чалавека ад прыроды павінны быць фундаментальныя якасці, якія яму спатрэбяцца як Прэзідэнту, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Іх шмат. Можа, адно, два, а можа быць, і ўсё. Гэта вельмі важна». Як прыклад ён прывёў нядаўнія прэзідэнцкія выбары ў ЗША, дзе галоўным сапернікам Дональда Трампа была жанчына Камала Харыс. Аляксандр Лукашэнка ўспомніў некаторыя абразлівыя выказванні ў яе адрас падчас электаральнай кампаніі. Па яго словах, у Беларусі кандыдат у Прэзідэнты, які б такое сабе дазволіў, страціў бы значную частку электарату. «Але для амерыканскага грамадства гэта, напэўна, нармальна. Яны правілі свае выбары. Памятаеце, я яшчэ да выбараў сказаў: чарнаскурага Амерыка гатова абраць — жанчыну Прэзідэнтам Амерыка, напэўна, не гатова яшчэ абіраць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. На яго думку, Камала Харыс прайграла выбары ў значнай ступені з-за рашэнняў дэмакратычнай партыі і Джо Байдэна. Па яго словах, дэмакратычная партыя мела кандыдатаў, якіх магла б вылучыць на выбары і з якімі Трамп не справіўся б. Аднак, па словах Аляксандра Лукашэнкі, цяпер самае галоўнае, каб Дональд Трамп выканаў свае перадвыбарныя абяцанні, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы: «У Амерыцы гэта проста — паабяцаць і не выканаць. Гэта ўсюды цяпер, але ў іх тым больш. Але ён усё ж такі вопытны чалавек, бульдозер гэты. Толькі каб горш не было ўсяму свету. Бо вядучая эканоміка, вядучая краіна, манапаліст, можна сказаць, ва ўсіх адносінах, у палітыцы ў тым ліку. Вельмі хацелася б, каб ён зрабіў Амерыку вялікай не на шкоду нам, не на шкоду ўсяму свету і не сутыкнуўся там з Расіяй, з Кітаем і з усімі разам. Трэба вельмі акуратна, першы той тэрмін яго гэтаму навучыў».

Вяртаючыся да выбрання жанчыны на пасаду прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі такое амаль

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

немагчыма. Ён растлумачыў гэта тым, што ў нашай краіне кіраўнік дзяржавы не толькі выконвае прадстаўнічыя або пратакольныя функцыі, але і працуе цэлымі суткамі, унікае ва ўсе пытанні. Важна, што ў Беларусі Прэзідэнт з'яўляецца дзейным галоўнакамандуючым. Гэта вельмі цяжкая работа.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, жанчына яшчэ і жанчынай павінна быць, клапаціцца пра сям'ю. «Таму жанчыну нельга абцяжарваць такімі паўнамоцтвамі, такімі абавязкамі. Пакуль у Беларусі ёсць жаночыя прэзідэнты — няхай будуць мужыкі, навошта жанчын абцяжарваць? — сказаў ён. — Не трэба перакладаць нашы абавязкі на жанчын. Я схіляюся перад жанчынамі, ніколькі не прыніжаючы іх ролю. Але яны павінны быць побач, каб мы маглі абаперціся на моцнае плячо, як у нас звычайна бывае».

## Еўропе патрэбны сапраўдныя лідары

У працяг тэмы з выбраннем Дональда Трампа на пасаду Прэзідэнта ЗША журналісты звярнулі ўвагу, што пасля яго перамогі еўрапейскія палітыкі сталі часцей казаць аб тым, што Еўропа павінна быць незалежнай. «Час пераабувацца, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Трамп гэтага не забудзе. Хаця я не прыхільнік, каб ён рахункі з кімсьці зводзіў. Не трэба быць злапамятным. Трэба ўсё адкінуць, закрэсліць. Ён разумны чалавек, не будзе па дробязях рахункі з кімсьці зводзіць. А яны задрыжалі ўжо, пераабувацца пачалі».

Беларускі лідар зрабіў акцэнт на тым, што палітыкі павінны адказваць за свае словы і прытрымлівацца свайго пункту погляду. У прыклад ён прывёў нядаўні кліматычны саміт у Баку. «Адзін еўрапеец (калі б мне не распавёў Рыжанкоў, я б не ведаў) адмовіўся фатаграфавацца («сямейнае фота» на саміце ў Баку), таму што там ёсць Лукашэнка. Ніхто гэта нават не заўважыў. Я там стаяў спакойна. Падышоў пакістанскі прэм'ер, многія падышлі, прывіталіся з павагай. Ну, як сям'я. Ніхто не заўважыў, што яго там няма. Бачыць ён, што не заўважылі, што яго там няма, і пайшоў пірыцца — «я не хадзіў фатаграфавацца». Ну і не хадзі, хто цябе там чакаў?! Вось гэта еўрапейцы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама расказаў, як польскі прэзідэнт распавядаў, як яго краіна ахоўвае расліны і жывёльны свет і ні слова не сказаў пра агароджу ў Белавежскай пушчы, з-за якой гінуць жывёлы. Па словах беларускага лідара, падобная сітуацыя была і на мінулым кліматычным саміце, дзе лідары розных дзяржаў красамоўна выказваліся аб парадку дня, але да рэальных дзеянняў ніхто так і не дайшоў. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такія мерапрыемствы праводзяцца толькі для птушачкі. Таму трэба клапаціцца найперш пра сваё, дбаць аб сваёй прыродзе.

Журналісты спыталі, ці можа быць такое, што Еўропа стане незалежнай ад ЗША і будзе развіваць адносіны з Расіяй. «Можа. Калі там «трампы» з'явяцца, можа быць. А так там няма каму. Вы ж паглядзіце. Не жадаю характарызаваць іх: гэта нядобра. Праўда, сёння амерыканцы ўжо пачалі аб Шольца ногі выціраць: што гэта «палітычны легкавес» і іншае. Уратуй бог, я не хачу так казаць. Гэта сын свайго народа: што немцы заслужылі, каго абралі, з тым няхай і працуюць. Усе піярацца, а прыняць рашэнне і дзейнічаць — не. Але яны прыйдуць да гэтага», — перакананы беларускі лідар. Ён упэўнены, што ў будучыні з'явяцца палітыкі ўзроўню Шарля дэ Голя, Гельмута Коля, Жака Шырака, якія ўвайшлі ў гісторыю як моцныя еўрапейскія кіраўнікі.

«Цяпер такіх няма. Усе дрыжаць. А чаго дрыжаць: танныя рэсурсы ў Расіі, тэхналогіі ў Германіі. А сёння аўтапрам і авія — ужо ўсё развальваецца. Вось да чаго давялі Еўропу, замест таго, каб быць разам, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму трэба прымаць рашэнні і рухацца ў гэтым кірунку. Еўропа для гэтага саспела. Еўропе патрэбны сапраўдныя лідары, якія будуць прымаць рашэнні і дзейнічаць». Па словах Прэзідэнта, да гэтага гатова і Расія, паколькі нікому не трэба сварыцца з еўрапейскімі суседзямі. Ён нагадаў, як перавярнулі старонку Другой сусветнай вайны, Вялікай Айчыннай вайны, у якіх загінулі мільёны людзей, паколькі трэба было рухацца наперад. «Не, пабеглі за амерыканцамі. А тыя думаюць, што адсядзяцца там. Ды ўжо не адсядзяцца. Таму складаная тут карціна такая, палітра сур'ёзная. Але ўсё рухаецца да гэтага. Трэба крыху цярпення, трэба час», — падсумаваў беларускі лідар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Парламенцкі дзённік

# «Усе спробы ізаляваць Беларусь на сусветнай арэне церпяць няўдачу»

## У Авальнай зале прайшло пасяджэнне другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу

**Парламентарыі разгледзелі шэраг законапраектаў. Так, у другім чытанні былі прыняты праекты законаў «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адукацыі»; «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ліцэнзаванні»; «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй»; «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб каштоўных металах і каштоўных камянях».**



Фота БелТА.



### «Мы павінны прайсці гэты шлях упэўнена і годна»

Перад разглядам законапраектаў да дэпутатаў звярнуўся **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА**. Ён адзначыў, што цяперашняя сесія праходзіць на фоне падзей сапраўды гістарычнага значэння як для будучыні нашай краіны, так і ўсяго свету.

«З правядзеннем прэзідэнцкіх выбараў 2025 года завяршыцца працэс абнаўлення грамадска-палітычнай сістэмы Беларусі ў адпаведнасці з прынятай на рэспубліканскім рэферэндуме абноўленай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Мэта ўсёй гэтай вялікай працы — забяспечыць краіне запас трываласці, які дазволіць нам захаваць суверэнітэт, мір і ўстойлівае развіццё на фоне тэктанічных зрухаў, што адбываюцца ў сусветнай палітыцы, — зазначыў спікер. — У жорсткай барацьбе мы адстаялі права беларускага народа самастойна вызначаць свой лёс, і час даказаў правільнасць прынятых рашэнняў».

Ігар Сергяенка падкрэсліў: ва ўмовах беспрэцэдэнтнага санкцыйнага ціску краіна працягвае ўпэўнена дэманстраваць сваю эканамічную ўстойлівасць і канкурэнтаздольнасць, эканоміка расце тэмпамі, вышэйшымі за сусветныя. Гэта дазваляе людзям нармальна жыць і працаваць, утрымліваць сем'і, а дзяржаве — выконваць свае сацыяльныя абавязацельствы і ўмацоўваць нацыянальную бяспеку.

«Пра тое, што на нашым баку праўда, сведчыць і той факт, што ўсе спробы прыхільнікаў так званага парадку, заснаванага на правілах, ізаляваць нас на сусветнай арэне, церпяць няўдачу, — працягнуў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Беларусь стала паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Зусім нядаўна краіна атрымала афіцыйны статус партнёра БРІКС, пацвердзіўшы тым самым сваю адпаведнасць стандартам і крытэрыям Арганізацыі. Менавіта гэтыя аўтарытэтныя міжнародныя аб'яднанні сёння аказваюць рэальны ўплыў на фарміраванне новага аблічча планеты. Таму з імі звязвае сваю будучыню ўсё больш краін глабальнай большасці».

Асобна Ігар Сергяенка адзначыў важнасць стаўлення да нашай дзяржавы ў названых аб'яднаннях: «...Беларусь тут разглядаюць у якасці раўнапраўнага ўдзельніка агульнай справы — стварэння светапарадку, заснаванага на прынцыпах раўнапраўя, узаемапавагі і эфектыўнага эканамічнага супрацоўніцтва. Невыпадкова мінская пляцоўка зноў аказалася запатрабаванай для развіцця дыялогу па бяспецы. На II Мінскай міжнароднай канферэнцыі па еўразійскай бяспецы кіраўнік дзяржавы гаварыў аб рэчах простых і зразумелых кожнаму здароваму чалавеку на планеце Зямля — аб міры, аб павазе нацыянальнай годнасці сваіх партнёраў, аб выгадах узаемаразумення, даверу і раўнапраўнага супрацоўніцтва.

Менавіта таму ідэя стварэння Хартыі разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі выклікае сёння вялікую цікавасць, прычым не толькі ў краінах глабальнага Поўдня, але і на Захадзе. Ва ўсялякім выпадку гэта пацвярджаюць вынікі нашых нядаўніх кантактаў з парламентарыямі Балгарыі, Сербіі, Славакіі, а таксама на азіяцкім і афрыканскім напрамках».

Гаворачы аб міжнародным іміджы краіны, Ігар Сергяенка зазначыў, што ён, імідж, не можа не турбаваць тых, хто адмаўляе нам у праве праводзіць незалежную ўнутраную і знешнюю палітыку. І дадаў, што цяперашнюю электаральную кампанію ворагі Беларусі зноў паспрабуюць выкарыстоўваць для дэстабілізацыі сітуацыі ў краіне.

«Аднак за апошнія гады беларускае грамадства значна пасталела ў палітычных адносінах. У абсалютнай большасці насельніцтва ёсць дакладнае разуменне, што лёс сваёй краіны можа вырашыць толькі яе народ, — сказаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Мы павінны прайсці гэты шлях упэўнена і годна. І на нас, як на дэпутатах, ляжыць свая доля адказнасці па абароне электаральнага суверэнітэту. Перш за ўсё гэта датычыцца заканадаўчай дзейнасці — час патрабуе аператыўных і максімальна выверанных рашэнняў, накіраваных на абарону правоў і законных інтарэсаў нашых грамадзян».

На заканчэнне прамовы Ігар Сергяенка азначыў, што ў гэты лёсавызначальны час парламентарыі абавязаны быць разам са сваімі выбаршчыкамі і трымаць руку на пульсе грамадска-палітычнага жыцця, растлумачваць меры, якія прымаюцца ўсімі органамі ўлады па вырашэнні пытанняў, што ўздымаюцца грамадзянамі, як на мясцовым, так і на рэспубліканскім узроўнях.

### Гарантыі маладым спецыялістам і адказнасць заказчыкаў «мэтавікоў»

Далей дэпутаты прыступілі да абмеркавання законапраектаў. **Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК** прадставіў праект Закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адукацыі». Ён адзначыў, што змяненні накіраваны на аператыўнае ўрэгуляванне найважнейшых пытанняў практычнага характару.

У прыватнасці, праектам закона прадугледжаны гарантыі маладым спецыялістам, звольненым з працы ў сувязі з прызывам на ваенную службу, але не накіраваным для яе праходжання, на занятак ранейшай пасады. Таксама пашыраюцца паўнамоцтвы мясцовых улад у пытаннях падвозу школьнікаў у межах буйных населеных пунктаў, а навучэнцам X-XI класаў дадзена магчымасць асваення адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын.

Акрамя таго, прадугледжана вызваленне выпускнікоў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, ад кампенсацыі затрачаных дзяржавай сродкаў пры немагчымасці выдзялення ім новага месца працы пры пераразмеркаванні ў населеных пунктах па месцы жыхарства, альбо па месцы ўключэння іх у спісы ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Дакумент узмацняе адказнасць заказчыкаў мэтавай падрыхтоўкі, а таксама ўтрымлівае шэраг іншых навацый.

### Усё стане працай

Праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю» прадставіў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Іван МАРКЕВІЧ**.

Сярод асноўных навацый праекта — увядзенне экстэрытарыяльнасці дзяржаўнай рэгістрацыі. То-бок па дзяржрэгістрацыю нерухомасці заяўнік зможа звярнуцца ў любое агенцтва, незалежна ад месца знаходжання нерухомасці без дадатковай аплаты за такую опцыю. Больш за тое, праектам прадугледжваецца магчымасць пасведчання дагавора двума або больш рэгістратарамі адной або розных тэрытарыяльных арганізацый па дзяржрэгістрацыі, што дазволіць ажыццявіць адпаведную працэдуру ва ўзгодненыя адзіны дзень і адзіны час у розных рэгістратараў у рэжыме відэа-канферэнцсувязі без сумеснай вочнай прысутнасці бакоў здзелкі. Таксама істотна аптымізуецца парадак узаемадзеяння паміж натарыусамі і рэгістратарамі.

Акрамя вышэйзгаданых дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі ў адным чытанні законапраекты «Аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да Статута Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай абароны»; «Аб ратыфікацыі пратакола аб унясенні змяненняў у Пагадненне аб прынцыпах і падыходах ажыццяўлення дзяржаўнага кантролю (нагляду) за выкананнем патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў Еўразійскага эканамічнага саюза ў мэтах гарманізацыі заканадаўства дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза ў названай сферы ад 16 лютага 2021 года»; «Аб ратыфікацыі пратакола паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Азербайджанскай Рэспублікі аб узаемным прымяненні электронных сістэм сертыфікацыі паходжання тавараў».

# У ратавальнікаў работы хапала

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Вядучы спецыяліст Гродзенскай абласной арганізацыі АСВОД Юрый ПАЛІШЧУК** падкрэсліў, што большасць утапленняў адбывалася не падчас купання. На прыкладзе Гродзенскай вобласці ён прааналізаваў лічбы.

— На сёння ў рэгіёне 30 патанулых. З іх толькі пяцёра патанулі пры купанні. Астатнія танулі ў непрафілактавальных месцах: пры падзенні ў калодзеж, які не выкарыстоўваецца, 200-літровую бочку, падвал жылога дома, у вадаёме-копані ў стане алкагольнага ап'янення, пры рыбнай лоўлі з берага ў стане алкагольнага ап'янення, пры перакульванні лодкі ў стане алкагольнага ап'янення, — адзначыў Юрый Палішчук. Ён дадаў, што асноўныя прычыны ўсіх гэтых няшчасных выпадкаў — купанне ў неабсталяваных месцах у алкагольным ап'яненні і з парушэннямі мер асабістай бяспекі.

Падобная сітуацыя з патанулымі складваецца і ў Мінску. Як расказала **вядучы спецыяліст Мінскай гарадской арганізацыі АСВОД Ілона МЯШКОВА,** з пачатку года ў сталіцы на вадаёмах выратаваны 22 чалавекі, патанулі 17. Пры гэтым толькі двое патанулі падчас купання.

Яшчэ адной прычынай утаплення з'яўляюцца хранічныя захворванні. **Спецыяліст па сувязях з грамадскасцю Гомельскай абласной арганізацыі АСВОД Наталля ЛУКАШОВА** прывяла прыклад са свайго рэгіёна:

— У падвале чалавек рамантаваў трубы. Узровень вады складаў усяго адзін сантыметр. У чалавека пачаўся прыступ эпілепсіі, ён упаў і патануў.

## Работа з дзецьмі і адкрыццё выратавальных пастоў

У кожнай вобласці можна вылучыць свае асаблівасці купальнага сезона. Напрыклад, **вядучы спецыяліст Брэсцкай абласной арганізацыі АСВОД Валерый ЯКІМУК** падкрэсліў, што купальны сезон у рэгіёне пачынаецца раней, чым у астатняй частцы краіны.

— Падрыхтоўка да купальнага сезона ў нас пачынаецца непасрэдна пасля заканчэння папярэдняга, каб ацаніць тыя месцы, якія карыстаюцца папулярнасцю ў насельніцтва, але пакуль не адносяцца да дазволеных, каб у будучым палепшыць і зрабіць іх такімі, — адзначыў Валерый Якімук.

Упор спецыялістамі АСВОД робіцца на работу з дзецьмі. У прыватнасці, арганізуючы наведванні класамі выратавальных станцый і пастоў, дзе школьнікам расказваюць пра асаблівасці работы выратавальнікаў, мерах бяспекі; праводзяцца практычныя заняткі па выкарыстанні першасных сродкаў для выратавання тых, хто церпіць бедства на вадзе.

**Вядучы спецыяліст Віцебскай абласной арганізацыі АСВОД Юрый КАПУСЦІН** расказаў, што абводненасць рэгіёна складае 31 працэнт, ён займае першае месца па гэтым паказчыку ў краіне. Сёлета на вадаёмах вобласці было асабліва шмат турыстаў. Адпачывальнікі прыязджалі не толькі з Беларусі, але і з Расіі. У гэтым годзе на Віцебшчыне было адкрыта два дадатковыя сезонныя выратавальныя пасты.

Як расказала Наталля Лукашова, аналіз няшчасных выпадкаў на вадзе ў Гомельскай вобласці сведчыць, што 100 % іх звязана з парушэннем мер асабістай бяспекі і купаннем у месцах, не прызначаных для гэтага. За апошнія чатыры гады ў рэгіёне назіраецца зніжэнне колькасці ўтапленняў, што звязана з прафілактычнай работай, у прыватнасці з правядзеннем сумесных з МНС, МУС і іншымі суб'ектамі прафілактычных рэйдаў. З пачатку года ў рэгіёне іх прайшло больш за 5,5 тысячы.

## Трое ў лодцы...

У Гродзенскай вобласці на вадаёмах падчас купальнага сезона выратавалі 19 чалавек, з іх дзевяць непаўналетніх. Пра неардынарны выпадак выратавання бацькі і сына расказаў Юрый Палішчук. У надзіманай гумавай лодцы знаходзіліся трое нецвярозых дарослых і 12-гадовы хлопчык. Апошні ўбачыў на паверхні вады рыбу, хацеў яе дастаць, скокнуў з лодкі і пачаў тануць. Вахценны назіральнік Зельвенскай выратавальнай станцыі заўважыў хлопчыка, які то з'яўляўся над паверхняй вады, то знікаў. На трывозе да месца здарэння выйшла выратавальнае судна. Адлегласць ад станцыі да яго складала каля 1000 метраў. Даставаць з вады прыйшлося і бацьку хлопчыка, які скокнуў з лодкі на дапамогу сыну. Абодвух выратавалі і даставілі на станцыю. Гродзенскі аблвыканкам адзначыў падзякамі вадалаза, выратавальніка і матарыста.

Прааналізаваўшы статыстыку па патанулых падчас купальнага сезона ў Мінскай вобласці, **вядучы спецыяліст Мінскай абласной арганізацыі АСВОД Міхаіл ФРАЛОЎ** звярнуў увагу, што 70—80 % утапленняў адбываецца ў сельскай мясцовасці. У сувязі з гэтым падрыхтаваны інфармацыйныя матэрыялы АСВОД, якія ў найбліжэйшым месяцы павінны быць раскленены ва ўсіх сельскіх выканкамах вобласці. Плануецца павялічыць колькасць выратавальных пастоў, а з УУС Мінаблвыканкама ўзгоднены план рэйдавых мерапрыемстваў на наступны год.

Міхаіл Фралоў звярнуў увагу, што Мінская вобласць займае ў краіне другое месца па абводненасці. Спецыфіка рэгіёна ў тым, што мінчане выязджаюць адпачываць на пляжы ў вобласць. Як правіла, гэта Мінскі, Пухавіцкі і Дзяржынскі раёны, таму нагрузка на выратавальнікаў павялічваецца. У рэгіёне за купальны сезон выратавана 36 чалавек, шэсць з іх непаўналетнія. У планах на наступны сезон — нарасціць колькасць выратавальных пастоў, акрамя таго, павялічыцца колькасць рэйдавых мерапрыемстваў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Кантэкст

# ДЗЕЛЯ ДЗЯЦЕЙ

## Традыцыйныя сямейныя каштоўнасці становяцца важнейшымі за знешні дабрабыт

**Адну папулярную ў Еўропе сацыяльную сетку нядаўна проста ўскалыхнуў пост 21-гадовай дзяўчыны з Латвіі. Моніка заявіла аб сваім жаданні пераехаць жыць з Ліепая ў Мінск, Беларусь. Яе намеры цалкам канкрэтныя: дзяўчына піша, што яна майстар манікюру і ў яе мінскім кабінеце ўжо заканчваецца рамонт... Адной з прычын рашэння аб пераездзе Моніка ўказвае: «Я хачу, каб у маіх дзяцей былі традыцыйныя сямейныя каштоўнасці».**

Гэта публікацыя сабрала нямала каментарыяў. Былі тыя, хто абураўся: маўляў, з «сапраўднай Еўропы» назад у «савок». Але большасць дзяўчыну падтрымалі: пішуць, што Беларусь — цудоўная краіна, Мінск — прыемны ва ўсіх адносінах горад, традыцыйна хваляць нашу чысціню і нашы беларускія прадукты.

Так, дзякуючы бязвізу, які дзейнічае сёння для жыхароў 35 краін Еўропы, а для суседзяў, у тым ліку і латышоў, ён па часе дзейнічае даўжэй, многія адкрылі для сябе нашу краіну, якая аказалася зусім не такой, як малявала іхняя прапаганда. Людзі едуць, нягледзячы на запалохванні — тых жа латышоў папярэджваюць на поўным сур'ёзе, што па прыездзе ў Беларусь іх тут жа завярбуе ўсюдыісная жудасная КДБ. Людзі едуць па танныя якасныя прадукты, людзі едуць адпачыць у нашы санаторыі, пагуляць па нашых гарадах, атрымаць асалоду ад нашай прыроды. Некаторыя сапраўды задумваюцца аб тым, што было б добра пераехаць сюды жыць.

Але пост гэтай маладой латышкі па імені Моніка, якая, напэўна, не мае праблем з латышскай мовай, якая, магчыма, можа нядрэнна ў плане матэрыяльным жыць і ў родным горадзе, якая дакладна ў пошуках лепшага жыцця — зноў жа ў плане матэрыяльным — можа як грамадзянка краіны ЕС беспераШкодна паехаць у любую еўрапейскую краіну, — ён не пра тое, не пра матэрыяльнае. «Традыцыйныя сямейныя каштоўнасці» — гэта не з разраду смачнай каўбасы ці таннага бензіну. Але яны ў Латвіі, як і ў многіх іншых краінах Еўропы, становяцца не меншым дэфіцытам, які не купіш ні за якія грошы.

Тое, што здавалася ад пачатку свету для людзей гэткім самым звычайным і неабходным, як паветра і хлеб, — сям'я, сёння ў «краінах развітой дэмакратыі» знаходзіцца пад пагрозай знікнення. Некаторыя эксперты лічаць прапаганду ЛГБТ мэтанакіраванай палітыкай міжнародных карпарацый: чалавек, які не мае дзяцей, не думае пра будучыню і ўсе сродкі траціць тут і сёння, ад чаго гэтыя карпарацыі толькі багацеюць... Але прапаганда гэта пад маскай дэмакратыі і свабоды самавыяўлення стала ў многіх «цывілізаваных» краінах палітыкай дзяржаўнай.

Латвія не можа пахваліцца эканамічным або дэмаграфічным ростам, затое ў яе першы ў свеце прэзідэнт-гей. У ліпені гэтага года ў краіне ўступіў у сілу «інстытут партнёрства», які ўзаконіў «рэгістрацыю адносін» паміж аднаполымі парамі. Карацей, росквіт «дэмакратыі». Але галоўная праблема ў тым, што гэта «дэмакратыя», якую людзі веруючыя называюць садомскім грахом, навязваецца іншым, якія нязгодныя, якія хочуць, каб сям'я ў іх была нармальная — а такіх людзей нават там, у Еўропе, несумненна больш. Ты можаш выхоўваць сваё дзіця ў спрадвечных традыцыях, адзіных, на тваю думку, правільных. Але яно прыйдзе ў дзяржаўную школу, і там яму раскажуць, што дзядзя можа жыць з дзядзем, а цёця — з цёцяй, і ў гэтым няма нічога благога. Ці выкладаць які-небудзь прадмет да яго ў клас прыйдзе «яно» — з барадой і ў сукенцы. А пасля дзіцяці прапануюць запоўніць анкету на прадмет, кім яно сябе адчувае. І калі ваш хлопчык адкажа, што яму падабаюцца лялькі, яго могуць прымусіць змяніць пол. А вас, калі станеце чыніць перашкоды, пазбавяць бацькоўскіх правоў і забяруць дзіця з сям'і.

